ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 35 (1305) | СУБОТА, 14-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 60 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Усямерна будзем падвышаць сваю баяздольнасьць

Прывітальная тэлеграма ЦК ЛКСМБ

Комсамольская конфэрэнцыя Н-скай стралковай дывізіі шле баявое комсамольскае прывітаньне Цэнтральнаму камітэту Ленінскага комсамоля Беларусі. Рашэньні IX усесаюзнага і X усебеларускага зьездаў КСМ зьявяцца грунтам у нашай далейшай рабоце.

Абяцаем накіраваць баявую моц на ваенізацыю грамадзянскага комсамолу. У сваю чаргу будзем усямерна падвышаць баяздольнасьць вайсковых частак.

Няхай жыве УсеКП(б)!

Няхай жыве комсамол Беларусі і яго ЦК!

ОРГАНІЗУЕМ НОВЫЯ СОТНІ ФАБРЫК МЯСА

XIII зьезд КП(б)Б, выходзячы з агульнага курсу партыі ў справе ператварэньня спажывецкіх раёнаў у раёны якія-б вытваралі прадукты спажываньня, і ўлічваючы спрыяючыя ўмовы БССР для разьвіцьця жывёлагадоўлі, намеціў кантрольныя лічбы разьвіцьця гурту буйнай рагатай жывёлы і сьвінагадоўлі.

XIII зьезд КП(б Б пастанавіў:—„Дабіцца максымальнага пашырэньня малочнага стада, аддаўшы у гэтых адносінах асаблівую ўвагу організацыі малочных жывёлагадоўчых савгасаў і колгасаў, паставіўшы задачай давесьці ў 1930-31 годзе таварны малочны гурт у савгасах і колгасах ня менш як да 75 тысяч галоў, а ў 1931-32 годзе ня менш 100 тысяч галоў“ І далей, у галіне сьвінагадоўлі, зьезд вызначыў „давесьці гурт сьвінаматак па савгасах і колгасах у 1930 і 1931 годзе ня менш як да 50.000 штук, а ў 1931-32 годзе ня менш 75.000 штук; у сьвінаводчых колгасах у 1930-31 годзе—ня менш 100.000 штук, а ў 1931-32 годзе—ня менш 150.000 штук.

Усё-ж „ня гледзячы на хуткі рост гурту ў аграмаджаным сэктары сельскай гаспадаркі, асабліва сьвіней пленум ЦК КП(б)Б прымаючы пад ўвагу спрыяючыя ўмовы ў БССР для разьвіцьця жывёлагадоўлі, лічыць што гэты рост зусім невыстарчальны і не забясьпечвае выкананьне пастаноў XIII-га зьезду КП(б)Б аб разьвіцьці жывёлагадоўлі“.

Разам з гэтым нельга не адзначыць, што зусім мала зьвяртаецца ўвагі па захаваньне і разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў аднаасобным сэктары.

Цэлы шэраг мясцовых і цэнтральных організацый, на якія ўскладзена непасрэдная адказнасьць за ажыцьцяўленьне гэтай бальшавіцкай програмы, не праявіў і не праяўляе дагэтуль патрэбнай бальшавіцкай энэргіі, найстойлівасьці і ўпартасьці ў працы. Шэраг колгасаў і раённых організацый праявіў праваопортуністычную практыку ў разьвіцьці жывёлагадоўлі. Шэраг раёнаў (Стара-Дарожскі, Сьмілаўскі, Чашніцкі і інш.) скарацілі кантрольныя лічбы разьвіцьця гурту жывёлы і сьвіней, сарвалі плян будаўніцтва сьвінарнікаў і комплектаваньня, не давалі пляны разьвіцьця жывёлагадоўлі да савгасаў і колгасаў, ня прынялі рэальных мер для падняцьця кармовай базы.

Комсамол Беларусі ўзяў летась шэфства над разьвіцьцём сьвінагадоўлі. Каб больш мобілізаваць увагу і ўзьняць практычны ўдзел шырокіх мас комсамольцаў, працоўнай моладзі, рабочых савгасаў, колгасьнікаў і аднаасобнікаў была праведзена сьвінаводчая этафэта КСМ і іншыя масавыя мерапрыемствы (Усебеларуская нарада па сьвінагадоўлі і г. д.) Усё-ж мы павінны адзначыць, што практычны ўдзел шэрагу комсамольскіх організацый у выкананьні пляваў разьвіцьця жывёлагадоўлі, будаўніцтва, організацый і ўкомплектаваньня жывёлагадоўчых організацый далёка недастатковы. Асобныя (Старадароская, сьмілаўская і інш. організацыі) яшчэ не павярнуліся тварам да жывёлагадоўлі, не паставілі задачу разьвіцьця жывёлагадоўлі, як адну з галоўных задач комсамолу ў барацьбе за спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі, барацьбе за вядучую галіву гаспадаркі свайго раёну, сельсавету, колгасу.

Вясна гэтага году павінна стаць рашаючай у разьвіцьці жывёлагадоўлі. За вясеньні пэрыод трэба выканаць плян будаўніцтва, комплектаваньня і падвесьці кармовую базу. Адсюль зусім відавочны тэмпы і размах працы комсамольскіх ячэек савгасаў і колгасаў. Кожная комсамольская ячэйка павінна змагацца за жывёлагадоўлю плянам опэрацыйна-спэцыялізаванага ўдару, вызначыць колькі за пэрыод падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы трэба організаваць жывёлагадоўчых савгасаў і колгасаў, колькі набыць жывёлы і г. д.

Наносячы руйнуючы ўдар па кулаку і ўсякіх спробах опортуністых скараціць пляны жывёлагадоўлі, комсамольскія ячэйкі пад кіраўніцтвам партячэек павінны паставіць у цэнтр увагі сваёй практычнай дзейнасьці барацьбу за пасьпяховую організацыю жывёлагадоўчых савгасаў і колгасаў, за іх умацненьне, за выкананьне пляваў будаўніцтва і ўкомплектаваньня, за кармовую базу, забясьпечыць пашырэньне пасеў- плошчы пад кармовыя культуры, організаваўшы працу ў сьвінаводчых савгасах і колгасах, на падставе комуністычных форм і мэтодаў—соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Давесьці плян разьвіцьця жывёлагадоўлі да кожнага савгасу і колгасу, забясьпечыць поўнае яго выкананьне—важнейшая задача комсамольскай ячэйкі.

„Працоўны Бэрлін не пакіне вуліц для фашысцкіх забойцаў“

15 лютага беспрацоўныя ўсяго сьвету выйдуць супроць ашуканцаў народу, штрэйкбрэхераў і агэнтаў юнг-капіталістых

Адказ на провокацыю нямецкіх фашыстых

БЭРЛІН. Нацыянал-соцыялістыя заклікалі к дэманстрацыі 15 лютага, ад 11 гадзіне дня, у Люстгартэне.

Гэта першая дэмонстрацыя нацыянал-соцыялістых у цэнтры Бэрліну, калі ня лічыць зрыву імі фільму Рэмарка „На Захадзе без перамен“.

У адказ на заклік нацыянал-соцыялістых, тэрмінова сабраўся ўчора бэрлінскі падрыхтоўчы камітэт па барацьбе з фашызмам і пастанавіў організаваць у той-жа дзень, 15-га, а 10 з палов. гадзіне дня, таксама на пляцы ў Люстгартэне, масавую антыфашысцкую дэмонстрацыю працоўных.

Камітэт заяўляе: „Працоўны Бэрлін не пакіне вуліцы для фашысцкіх забойцаў, ашуканцаў народу, штрэйкбрэхераў і агентаў юнг-капіталістых“.

У Аўстрыі беспрацоўе нячувана вырасла

ВЕНА. 8.—Колькасьць беспрацоўных ў Аўстрыі, якія атрымліваюць пэнсыю, дасягнула ў канцы студзеня 331.000 чал. Колькасьць беспрацоўных прамысловых рабочых уключаючы і тых, хто не атрымлівае ніякай пэнсыі, па вестках рэволюцыйнай профопозыцыі дасягае ў Аўстрыі 600.000 чал.

„Хто выйдзе за дзьверы, таму пагражае сьмерць“

НЬЮ-ЁРК. Беспрацоўныя ў Рыо-дэ-Жанэйро актыўна рыхтаваліся да галоднага паходу, які павінен быў адбыцца 19 студзеня.

У ноч на 19 студзеня паліцыя зьняла ўсе плякаты, заклікаючыя рабочых удзельнічаць у дэмонстрацыі і арыштавала больш 20 камуністых. 19 студзеня раніцою ў рабочыя раёны былі пасланы вялікія атрады салдат і паліцыі, а ва ўсіх буржуазных газэтах было надрукавана „Хто выйдзе за дзьверы, таму пагражае сьмерць“

Галодны паход беспрацоўных быў сарваны.

Аўстрыйскі комсамол змагаецца з паклёпамі рэформістых

ВЕНА. 6.—У сувязі з ростам зацікаўленасьцю працоўных мас Аўстрыі да соцыялістычнага будаўніцтва у СССР, рэформістыя разгарнулі па ўсёй краіне систематычную антысавецкую агітацыю. Ва ўсіх сацыял-дэмократычцых організацыях моладзі робяцца даклады аб становішчы ў СССР, насычаныя агіднейшымі антысавецкімі выдумкамі. Аўстрыйскі комсамол разгарнуў рашучую барацьбу супроць гэтай паклёпніцкай кампаніі.

Ствараецца чырвоны профсаюз маракоў, партовых рабочых і рабочых воднага транспорту

Пролетарыі Гамбургу працягваюць барацьбу

БЭРЛІН, 12. Сход бастуючых партовых рабочых Гамбургу пастанавіў працягваць забастоўку і ўзмацніць меры барацьбы супроць штрэйкбрэхерства.

Бастуючыя рабочыя Вільгельмбургу выпусьцілі адозву аб падрыхтоўцы да арганізацыі чырвонага профсаюзу маракоў і партавых рабочых. Аналёгічная адозва параходных і кацёльных рабочых сустрэла ўсеагульную ўхвалу.

Ствараецца чырвоны профсаюз маракоў, партавых рабочых і воднікаў. Рэзолюцыя адзначае, што рэформісцкі профсаюз рабочых воднага транспарту выліўся ў штрэйкбрэхерскую організацыю, у якой пануюць профбюрократы. Паліцэйскі тэрор супроць бастуючых узмацняецца з кожным днём. Дзейнічаньнямі паліцыі кіруе начальнік паліцыі соцыял-дэмократ.

Сэкратар гамбургскай організацыі комсамолу ўжо некалькі дзён знаходзіцца ў папярэднім зьняволеньні па абвінавачаньню ў „дзяржаўнай здрадзе“.

Рыхтуюць паход на жыцьцёвы ўзровень працоўных

„Урад вядзе краіну да фінансавай катастрофы“

ЛЁНДАН, 11. Спрэчкі ў палаце абшчын з поваду ўнесенай консэрватарамі рэзолюцыі недавер'я ўраду прашлі пад знакам падрыхтоўкі наступу ўсіх трох партый буржуазіі на жыцьцёвы ўзровень рабочых.

Унёсшы ад імя консэрватараў рэзолюцыю недавер'я былы ваенны міністар ва ўрадзе Больдуіна, Вортынгтон Эванс, абураўся тым, што выдаткі па дапамозе беспрацоўным складаюць 45 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, замест прадугледжаных 12 з паловай, а таксама ростам падаткаў, сумы якіх павялічыліся на 50 мільёнаў ф. стэрлінгаў. Эванс бедаваў з тае прычыны, што крэдыт Ангельшчыны падрываецца, што ўцечка золата з Лёндану ня спыняецца. Па яго словах, урад вядзе краіну да фінансавай катастрофы.

Выдатным па-свайму анты-рабочаму характару быў адказ міністра фінансаў Сноўдэна, які заявіў, што выдаткаваньне сродкаў на дапамогу беспрацоўным, як гэта мае месца ў сучасны момант, немагчыма. Пытаньне павінна быць вырашана шляхам згоды паміж усімі партыямі. З другога боку, Сноўдэн лічыць немагчымым павялічэньне выдаткаў пры сучасным становішчы прамысловасьці, бо гэта была-б кропляй, якая перапоўніць келіх цярпеньня. Стан бюджэту, па словах Сноўдэна, вельмі сур'ёзны: Чакаецца к канцу году буйны дэфіцыт. Выдаткі ўзрасьлі. Прыбытак зьменшыўся. Сноўдэн лічыць, што асноўнымі прычынамі цяжкасьці сучаснага становішча зьяўляецца рост беспрацоўя, з аднаго боку, і вялізарны цяжар ваенных даўгоў—з другога. Выхад Сноўдэн знаходзіць у зьніжэньні заработнай платы:—„Намаганьні перамагчы крызіс,—закончыў Сноўдэн,—пацягнуць за сабою часовыя ахвяры з боку ўсіх“.

Прамова Сноўдэна, так адкрыта высунутая супроць зьніжэньня дапамогі па беспрацоўю і скарочаньня заработнай платы, зрабіла вялізарнае ўражаньне ў палаце.

Прадстаўнік левага крыла лейбарыстых, Броун, заявіў, што прамова Сноўдэна зусім разбурае надзеі рабочых, з корнем вырывае ўсю філёзофскую аснову, на якой пабудаваны рабочы рух. Павінен быць народжаны новы рух, на чале якога стануць новыя людзі, якія адвергнуць філёзофію старых партый і заклічуць не да слоў, а да дзеяньняў.

Міністар гандлю Грэхем стараўся зьмякчыць рэзкасьць Сноўдэна, высунуўшы вядомую двудушную форму аб шчыра шукаючых работу, якім урад, па яго думцы, павінен дапамагаць.

Далей Грэхем настойваў на неабходнасьці вырашыць проблемы сабекошту (што зноў-такі, бясспрэчна, пацягне за сабою націск на заработную плату).

Ад імя лібэралаў Дональд увёс папраўку да рэзолюцыі консэрватараў, якая патрабуе, каб урад назначыў „незалежную“ камісію для абгаварэньня пытаньня аб скарочаньні выдаткаў. Рэзолюцыя консэрватараў адхілена 310 голасамі супроць 35.

Папраўка лібэрала прынята 468 голасамі супроць 21 голоса дэпутатаў левага крыла лейбарыстых.

Ахвяры фашысцкага тэрору



У канцы студзеня каля Гамбургу быў забіты фашыстымі малады [illegible]-гадовы рабочы Бэрнард Гайк.
На здымку: тав. Гайк у гробе.

Амэрыка забараніла ўвоз лесу і драўніны з 4-х раёнаў СССР

ВАШЫНГТОН, 10. Міністэрства фінансаў ПАЗШ публікуе загад, якім заяўляе, што пры лесараспрацоўках і здабычы драўнай масы ў Карэліі, на Сольскай паўвысьпе, у паўночным краі і ў Зыранскім краі ўжываецца праца зьняволеных, дзеля гэтага мытнае бюро наперад ня будзе дапускаць лес і драўную масу, якая прыбывае з гэтых 4-х раёнаў, таксама як і ня будзе дапускаць ніякіх тавараў, вырабляных дзе-б там ні было з лесу і драўнай масы гэтых раёнаў, калі толькі імпорт не дасьць довадаў, што праца зьняволеных ня была скарыстана пры вырабе гэтых тавараў.

Таварыш міністра фінансаў ПАЗШ Лёўман заявіў корэспондэнту ТАСС, што апублікаванае ўчора афіцыйнае заключэньне, якое гаворыць, што савецкі лес і драўная маса здабычы пры дапамозе працы зьняволеных, асновона на простым довадзе, здабытым абсьледвальнікам у Архангельску.

Лёўман адмаўляў, што абсьледвальнікаў паслала міністэрства фінансаў і падкрэсьліў, што дзяржаўны дэпартамэнт (міністэрства чужаземных спраў) аднёсься адмоўна да пасылкі абсьледвальнікаў у Савецкі Саюз, паколькі савецкі ўрад адхіліў зробленую мінулым летам фірмай „Дэттон Кампані“ прапанаеву паслаць абсьледвальнікаў.

ПАРАД АДСТАЮЧЫХ

Комсамол Барысаўшчыны ня стаў на чале ініцыятывы рабочай моладзі ў барацьбе за прамфінплян

Вытворча-бытавымі комунамі, шырока разгорнутым соцспаборніцтвам штурмаваць прарывы

ПЕРАЛОМУ ЯШЧЭ НЯ БЫЛО

Барысаўская організацыя комсамолу павінна ліквідаваць допушчаныя прарывы

Факты гавораць: за ўдарны квартал „Чырвоная Бярэзіна“ (Н.-Барысаў) прамфінплян ня выканала ні па колькасных, ні па якасных паказчыках. Студзень месяц ніякага пералому ня даў, а наадварот,— прарывы павялічыліся. За гэты час фабрыка выканала прамфінплян на 89,7 проц., „Пролетарская Перамога“ за студзень месяц дала таксама вялікія прарывы.

Асобны квартал завод „Комінтэрн“ скончыў недавыкананьнем прамфінпляну на 16,5 проц па лесапільнай вытворчасьці, на 28 проц. па фанернай. Студзень месяц таксама ня даў пералому.

Аналёгічнае становішча і на іншых прадпрыемствах. Прастоі заядаюць фабрыкі і заводы. Гэтыя прастоі выкліканы вялікаю апаратаў, незацікаўленасьцю і адсутнасьцю кіраўніцтва з боку заводзкіх і фабрычных організацый, казёншчынай і нядбайнымі адносінамі і тэхнічнага пэрсоналу.

Прамфінплян на 3-ці рашаючы год пяцігодкі большасьцю фабрык і заводаў не даведзен да варштата, да паасобнага рабочага (Чырвоная Бярэзіна“, „Пролетарская Перамога“ „Комінтэрн“, „Профінтэрн“, „Домбаль“).

Комсамольскія ячэйкі не разгарнулі адпаведнай работы па мобілізацыі рабочай моладзі на выкананьне плянаў 3-га году пяцігодкі, на ліквідацыю прарываў, якія былі допушчаны за мінулы час.

4-га лютага быў склікан агульна-гарадзкі комсамольскі сход активу. Сход быў назначаны на 6-ую гадзіну, але пачаўся а 8-ай. Замест 400 чалавек зьявілася толькі 200. Сход заслухаў даклад прадстаўніка ЦК ЛКСМБ аб выніках IX-га і X-га зьездаў ЛКСМ.

Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі. Ня гледзячы на тое, што пытаньне аб становішчы організацыі ня было пастаўлена, таварышы галоўным чынам гаварылі аб становішчы організацыі.

Яны гаварылі аб буйнейшых прарывах, якія маюцца ў Віцебскай організацыі. Яны ня толькі пацьвердзілі сыгналы „Зьвязды“ і „Чырвонай Зьмены“, але дадаткова выкрылі недахопы ў працы РК.

Тав. Каган гаварыў аб барацьбе комсамолу за прамфінплян.

— У большасьці прадпрыемстваў,—кажа ён,—прамфінплян не даведзен да варштата. Шэрагам фактаў т. Каган даводзіць прычыны недавыкананьня прамфінпляну. Комсамольскі варштат („Домбаль“) працаваў добра і ўвесь час выконваў прамфінплян на 112—120 пр. Але ня было кіраўніцтва, і зараз ён значна адстаў у сваёй рабоце. РК комсамолу займаўся разгортваньнем лёгкава-опэрацыйнай групы, але недастаткова. Пытаньнем рацыяналізацыі і вынаходзтва ячэйкі таксама мала займаліся.

Ударніцтва на многіх прадпрыемствах—у заняпадзе. Не ўсе комсамольцы—ўдарнікі. Характарызуючы працу РК, тав. Фрыдлянд прыводзіць факт, што ў РК няма вестак аб ходзе выкананьня прамфінпляну.

Астатнія таварышы адзначылі слабасьць культмасавай працы, недастатковае разгортваньне самакрытыкі па організацыі, зусім слабую працу комсамолу ў галіне рабочага забясьпячэньня і падрыхтоўкі кадраў.

Аб кадрах гаварыў тав. Штэрн: ФЗВ электроманцёраў існуе ўжо два гады, а за гэты час вучні ні разу не насылалі на практыцы, ні граша стыпендыі вучням не далі.

Райком не мобілізаваў масы на ліквідацыю прарываў у організацыі.

Барысаўская організацыя комсамолу у асноўным ударная і ідэолёгічна вытрыманая. Яна здольна ліквідаваць і ліквідуе прарывы, якія былі ў організацыі. Раённаму кіраўніцтву неабходна пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы, каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне прамфінпляну рашаючага году пяцігодкі і ліквідацыю тых прарываў, якія былі допушчаны ў мінулым.

Гр. Кугель.

ВІНАВАТЫХ— ДА АДКАЗНАСЬЦІ

Завод „Труды“, Полацкага раёну, зьяўляецца адзіным заводам на Беларусі, які выпрацоўвае аконнае шкло. За апошні час на гэтым заводзе стварыўся вялізарны прарыў у выкананьні прамфінпляну.

Два тыдні ўжо завод не працуе з-за недахопу сыравіны і паліва.

5-га лютага на завод прыбыла сыравіна і варштаты пачалі працаваць. Але праз 6 гадзін, з-за нядбайных адносін тэхнічнага пэрсоналу, завод спыніўся, бо ў шыхту замест 6 проц. вугалю ўсыпалі 11,5 проц. ад чаго колер шкла стаў жоўтым.

Такім чынам прышлося выпусьціць звыш 400 пудоў шкла і праводзіць новую варку.

Трэба, каб належныя органы высьветлілі гэты факт шкодніцтва і прыцягнулі да суровай адказнасьці вінаватых у гэтым здарэньні.

Кветка

Рыхтавацца да будаўнічага сэзону

ЛЕСАЗАВОДЫ ПАГРАЖАЮЦЬ БУДОЎЛІ

Яны не даюць патрэбнай колькасьці лесаматар'ялаў

Набліжаецца будаўнічы сэзон. Першыя зьвесткі з фронту падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону сыгналізуюць аб вялікай небясьпецы ў гэтай галіне. Да гэтага часу ня вызначаны об'екты будаўніцтва, не пастаўлена на баявую нагу забясьпечаньне будаўніцтва лесапілматар'яламі.

Зьмешчаныя сёньня матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што праца лесазаводаў, якія павінны забясьпечыць будаўніцтва лесаматар'ялам і фанерай, не пастаўлена на належную вышыню. Той факт, што Койданаўскі лесазавод не працуе, Капцэвіцкі завод „Зорка“ працуе з вялікімі перабоямі, на Стара-Дарожскім лесазаводзе „Пролетары“ няма ніякай політ-выхаваўчай працы сьведчыць аб тым, што ў гэтай галіне неабходны карэнны пералом.

Комсамольскія організацыі павінны зараз жа заняцца праверкай становішча заводу і мобілізаваць усе сілы рабочай моладзі на забясьпечаньне заводаў піла-леса-матар'ялам з тым, каб гэтыя заводы маглі ў сваю чаргу забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва патрэбным матар'ялам.

Неабходна перакінуць на гэтыя заводы вопыт скразнога конвэеру якасьці, правесьці вытворчыя манэўры з тым каб кантрольныя лічбы нашага будаўніцтва па асобных галінах вытворчасьці былі выкананы.

Гэтага патрабуюць задачы соцыялістычнага будаўніцтва.

Вытворча-бытавой комунай змагацца за прамфінплян

У прэзыдыум Менгарсавету

Барацьба за выкананьне прамфінпляну як якасных, так і колькасных паказчыкаў, патрабуе больш спрыючых бытавых умоў для жыцьця рабочай моладзі.

Ніжэй мы зьмяшчаем адкрыты ліст комсамольцаў Менскай абутковай фабрыкі да Менгарсавету з просьбай перадаць памяшканьне старое сынагогі альбо манастыра пад вытворча-бытавую комуну.

Просьба рабочай моладзі фабрыкі павінна быць задаволена.

Адкрыты ліст

Дарагія таварышы! Комсамольская організацыя Менскай абутковай фабрыкі, пад кіраўніцтвам партыйнага колектыву, зьдзейсьніла карэнны пералом ува ўсёй рабоце фабрыкі. Усе комсамольцы і беспартыйная рабочая моладзь ахоплены комунамі і брыгадамі.

Комсамольцы вядуць рашучую барацьбу за выкананьне колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну. К канцу другога году пяцігодкі і ўдарнага кварталу комсамол абвясьціў паход за якасьць і рашучую барацьбу з лятунствам.

Аднак, большая частка моладзі, якая працуе на фабрыцы, прыехала з вёсак і знаходзіцца ў надзвычайна дрэнных умовах. Моладзь вельмі часта начуе ў сталоўцы, фабкоме, на сталох ленкутка і калідорах.

Ёсьць факты, калі комсамолкі, працуючы на фабрыцы, адначасова наймаюцца хатнімі работніцамі, каб знайсьці кут для начлегу.

Такія ўмовы не спрыяюць барацьбе за прамфінплян, больш адсталую частку моладзі штурхаюць на лятунства, і значна адбіваюцца на культурным становішчы моладзі.

Мы зьвярталіся да новага складу Гарсавету з просьбай прыйсьці нам на дапамогу і даць памяшканьне старое сынагогі альбо былога манастыра, каб можна было організаваць маладзёжную бытавую комуну для абутковай фабрыкі.

Просім прэзыдыум Менгарсавету на бліжэйшым пасяджэньні абгаварыць гэта пытаньне і задаволіць патрэбаваньне моладзі нашай фабрыкі, якая жадае ў складзе 60 асоб увайсьці ў комуну.

Колектыў рабочай моладзі Менскай абутковай фабрыкі



Рвач кандрує

На „Зорцы“— небясьпечна

Рабочыя Капцэвіцкага заводу „Зорка“ ўзялі на сябе сустрэчным прамфінпляном абавязак выпусьціць 24.600 км фанеры. Першы месяц 31-га году паказаў, што сустрэчны прамфінплян выканан ня будзе, бо завод надзвычайна дрэнна забясьпечан сыравінай.

Заводакіраўніцтва, замест мобілізаваць усе сілы на забясьпечаньне заводу, скідала віну за прарывы на колектыў рабочых. Рабочая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна, бо няма работы. Раней машыны выразалі па 5-6 мэтраў шпону, а зараз выразваюць толькі паўтара-два мэтры, і гэта з-за недахопу паліва і нарасіявога руху.

Надзвычайна дрэнна пастаўлена культурна-выхаваўчая праца на заводзе.

Комсамольскі колектыў намоўразважаны. Комсамольцы не мобілізаваліся на ліквідацыю прарыву шляхам барацьбы за забясьпечаньне і эканомнае выдаткаваньне матар'ялу.

Грамадзкае харчаваньне не прыстасавана да зімовых умоў заводу.

Усё гэта стварае пагрозу вялікага прарыву ў выкананьні прамфінпляну заводам „Зорка“. Неабходна прыняць тэрміновыя захады, каб забясьпечыць завод своечасовай дастаўкай матар'ялу і лепш організаваць усю работу заводу.

Рабочы

Ня дымяць трубы

Галавацяпы давялі да астаноўкі лесазавод

Асобны квартал кастрычнік-сьнежань месяц на Койданаўскім лесазаводзе сарваны, выканана толькі 50 проц. За студзень месяц 1931 г. прамфінплян выканаты на 62 пр. Два месяцы таму назад завод працаваў на дзьве зьмены, потым перайшоў на адну, а 1-га лютага 31 году завод зусім стаў. Ня дымяць больш трубы.

Рабочыя заводу, Зуеўскі, Ахмэд-Ханаў Ф. і Быстрыновіч, пасланыя заводам у колгасы і вёскі для мобілізацыі насельніцтва на вывазку лесу, замест правесьці гэтую работу па-ўдарнаму, напіліся, набузілі, а лесу заводу не далі. Завод стаіць.

Вытворчая камісія не працуе. Працдысцыпліна адсутнічае. Адміністрацыя заводу ня прымае да прогульшчыкаў і рвачоў ніякіх захадаў; звальняе і зноў прымае на работу.

Партыйная і комсамольская ячэйкі заводу ня прымаюць ніякіх мер да ліквідацыі прарываў, не мобілізуюць рабочых на выкананьне прамфінпляну, не праводзяць сярод іх культмасавай работы.

За прарыў прамфінпляну і прастоі заводу неабходна прыцягнуць да адказнасьці кіраўніцтва заводу, ачысьціўшы завод ад рвачоў, п'яніц і ўсіх тых, хто перашкаджае выкананьню прамфінпляну.

Юдзенкоў

Узьняць політвыхаваўчую працу

Добра прыглядзеўшыся да пільні „Пролетары“ (м. Старыя Дарогі), можна ўбачыць шмат недарэчнасьцяй у яе працы. Прагульшчыкам і лятунам ня даецца організаванага рашучага адпору.

Культмасавая праца сярод рабочых пастаўлена зусім дрэнна. Лікпункт пры заводзе не працуе і ніхто гэтым не цікавіцца. Клюб, як культурная ўстанова, таксама закінуты і нікога там ня ўбачыш. Бібліотэка ўжо два гады не працуе. Ніякай сучаснай літаратуры няма, а старыя кніжкі знаходзяцца ў такім стане, што ўсё роўна імі ніхто ня можа карыстацца.

Вопыт працы грамадзкіх організацый лесазаводу „Пролетары“ можа быць узорам, як ня трэба ставіць паліт. масавую выхаваўчую працу. Грамадзкія організацыі заводу ня сталі на чале барацьбы за прамфінплян, за ўздым працоўнай дысцыпліны.

У сувязі з падрыхтоўкай да будаўнічага сэзону, завод павінен зрабіць карэнны пералом, дабіўшыся падняцьця працоўнай дысцыпліны, палепшаньня культурна-выхаваўчай працы, змагаючыся з усімі тымі, хто перашкаджае пасьпяхова выконваць прамфінплян.

Комсамолец.

Другой бальшавіцкай вясьне— бальшавіцкую сустрэчу

„...Трэба рашуча павярнуцца тварам да падрыхтоўкі пасеўнай кампаніі, перастаць таптацца ў канцылярыі, павярнуць усю пролетарскую грамадзкасьць да гэтага пытаньня, зьвязваючы ўсю пасеўную кампанію з павышэньнем тэмпаў колектывізацыі“ *(З прамовы т. Шаранговіча на пленуме ЦК КП(б)Б)*

Не далі адпору

Шэраг ячэек Вузьдзенскай організацыі ЛКСМБ усё яшчэ у баку ад падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы, зьяўляецца вічым іншым, як правым опортунізмам на практыцы.

На мінулым раённым сходзе былі выступленьні паасобных сэкратароў ячэек, якія па сутнасьці дэзорыентавалі організацыю, замазаючы факты яе бязьдзейнасьці.

Сэкратар Каменскай ячэйкі, Марцінчык, даводзіў раённаму сходу, што ў іх ячэйцы ўсё добра, што ячэйка праводзіць належную працу па калгаснаму будаўніцтву. На справе-ж гэтага няма. Сам Марцінчык, член колгасу „Навае Жыцьцё“, акрамя агульных разважаньняў і крыкаў аб колектывізацыі нічога канкрэтнага ня робіць у сваім колгасе. Колгас складаецца толькі з 3-х гаспадарак знаходзіцца ў надзвычайна дрэнным становішчы.

Яшчэ больш абураючы факт політычнай бліскрукасьці і бязьдзеянасьці назіраецца з боку комсамольскай ячэйкі колгасу „Будаўнік“ „25-тысячнік“ тав. Пушканскі не спаткаў таварыскіх адносін і падтрыманьня ў працы з боку ячэйкі. Ячэйка прымірэнча адносіцца да антысэміцкага контр-рэволюцыйнага цкаваньня яго кулачкаю Гурскай і падкулачніцай антысэміткаю—Рудаміцкай (матка сэкратара комсамольскай ячэйкі). Яны вядуць шалёную агітацыю сярод колгасьнікаў і сялянства: „Пушканскі—жыд, нам жыдоў ня трэба“. Такія яўна клясава-варожыя выступленьні ня сустрэлі рашучага адпору з боку комсамольскай ячэйкі. На ат сэкратар Вузьдзенскага РК, тов. Шырко, будучы ў гэтай ячэйцы і ведаючы аб вылазках клясавага ворага і прымірэнстве ячэйкі, не завастрыў увагі ячэйкі. Падкулачніца Рудаміцкая і па сёньня ў колгасе. Калі стаяла пытаньне аб выключэньні яе, дык чатыры комсамольцы галасавалі супроць.

Гэта ёсьць просты сабатаж дырэктыў партыі. Організацыі ЛКСМБ павінны дапамагаць 25-тысячнікам ачышчаць колгасы ад клясава-варожых элемэнтаў.

К-нік

У палоне ворага

Яскравым фактам клясавай сьлепаты, прымірэнчых адносін да клясавага ворага ў абставінах абвостранай клясавай барацьбы на вёсцы, зьяўляецца праца комсамольскай ячэйкі колгасу „Дукора“ (Сьмілавіцкі раён).

Яшчэ у час уборкі ўраджаю комсамольцы выкарыстоўвалі недахоп рабочых рук, займаліся рвацтвам.

Каб скасіць віку, выкапаць траншэі бралі ўдвая-утрая даражэй ус тапоўленай расцэнкі. Зараз комсамольцы выкарыстоўваюць недахоп трактарыстых і пералётваюць у пошуках „цёплага месца“.

Ячэйка Дукорскага колгасу пашла на повадў клясавага ворага, стала ў баку вялікае працы па калектывізацыі вёскі, у баку ад клясавай барацьбы. У працы колгасу шэраг прарываў. Комсамольская ячэйка колгасу нічога не робіць, каб пабальшавіцку правесьці перавыбарчую кампанію кіраўнічых органаў колгасу і пасеўкампаніі другой бальшавіцкай вясны.

А. С.

У абозе падрыхтоўкі

Колгас „Зьвязда“, Сьмілавіцкага раёну, адстае ў падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Рабочая сіла ў колгасе не разьмеркавана. Яшчэ да гэтага часу не абмалочана трэцяя частка вясновага збожжа, няма працоўнай дысцыпліны, многія колгасьнікі ня выходзяць на працу ў вызначаны час.

Праўленьне колгасу нічога ня робіць для падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Не распачалі яшчэ раменту сельска-гаспадарчых машын.

Бязьдзейнічае і комсамольская ячэйка.

Вожык.

Паказаць тэмпы

Комсамольская ячэйка колгасу „Інтэрнацыянал“, Буда-Кашалеўскага раёну, зараз ніякай працы не праводзіць. Амаль ужо два месяцы, як ня было сходу. Перавыбарчая кампанія сельсаветаў і загатоўкі ўсіх відаў праходзяць па-за ячэйкаю. Ячэйка ня удзельнічае і ў вясеньняй пасеўкампаніі.

Прызначаны суботнік для збору попелу быў сарваны, бо комсамольцы не зьявіліся.

У справаздачна-перавыбарчай кампаніі праўленьняў колгасаў ячэйка ня ўдзельнічала.

Апынуўшыся ў права-опортуністычным алоце, ячэйка ня здолела па-бальшавіцку ажыцьцявіць ускладзеныя на яе абавязкі. Гэта патрабуе зараз-жа заняцца праверкай ячэйкі ў напрамку яе здольнасьці ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

У вясеньнюю пасеўкампанію ячэйка павінна паказаць баявыя тэмпы і творчы энтузіязм у справе організацыі колгаснага прыліву і новых калгасаў.

Шэйн і Паўлючэнка.

„І бяз нас абыйдуцца“

Лагойская раённая організацыя комсамолу не разгарнула падрыхтоўкі да весновай сяўбы. Колгасныя ячэйкі ня прымаюць удзелу ў падрыхтоўчай працы колгасаў да другой бальшавіцкай вясны. Па колгасах і сельсаветах яшчэ не распачата ачыстка насеньня. З 11 сельсаветаў пачалі ачыстку толькі тры.

Пытаньне перавыбараў кіраўнічых органаў колгасаў праходзіць міма раённай організацыі. Раённае кіраўніцтва праводзіць яўна опортуністычную лінію. Пасыўна сузірае. „Абыйдуцца і без комсамольскай організацыі“—кажа сэкратар Лагойскага райкому комсамолу.

Б. Л.

Пад знакам масавага прыліву

МАГІЛЕЎ, 11.—(Наш карэспондэнт)—9-га лютага скончыў працу 6-ы зьезд саветаў Магілеўшчыны. Усе дэлегаты абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя X-га ўсебеларускага зьезду саветаў для пасьпяховага правядзеньня ільнозагатовак і 2-ой бальшавіцкай вясны.

У Вендаркім сельсавеце, у сувязі са зьездам, адбыўся масавы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы. За гэты час у колгасы сельсавету ўвалося 137 новых гаспадарак.

У вёсцы М...алева організаваўся новы колгас.

Віт. Сідарук

Рудзенскі с.-савет бязьдзейнічае

У Рудзенскім сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну, да гэтага часу не распачалася падрыхтоўчая работа да вясеньняй сяўбы. —Пляны сяўбы не даведзены ні да колгасаў ні да вёсак.

Колгасы сельсавету, замест распачаць ачыстку насеньня, рамонт інвэнтара і інш. работ,—нічога не робяць.

С.

ПЕРАТВОРЫМ БССР У КРАІНУ ВЫРАБУ МАЛАКА І МЯСА

Комсамол, у першыя шэрагі за вырашэньне мясной проблемы

Жывёлагадоўля павінна быць вядучай галіною гаспадаркі ў раёне

Опортуністыя з кіраўніцтва Райжывёлаводсаюзу зрываюць выкананьне пляну

Стара-Дароскі раён вызначан пад жывёлагадоўлю. Ужо сёлета жывёлагадоўля павінна стаць вядучай галіною гаспадаркі раёну.

Па пляну Малжывёлсаюзу да канца 1931 году гурт рагатай жывёлы трэба давесьці да 29.794 галоў. З гэтага ліку трэба мець да вясны 1172 штукі буйнай жывёлы і 1120 штук маладняка.

Лічба зусім рэальная для раёну і ёсьць усе магчымасьці для іх выкананьня. У раён жо завезена 1000 галоў буйнай рагатай жывёлы Але Раймалжывёлсаюз стаў на шлях найменшага супраціўленьня і скараціў кантрольнае заданьне на 1096 галоў.

Нездавальняюча разгорнута будаўніцтва хлявоў для жывёлы. Да вясны павінна быць пабудавана 20 хлявоў на 25 00 галоў рагатай жывёлы. Будаўніцтва не распачалі ні ў адным колгасе, а колгасы „Май“, „Чырвоная Беларусь“ і інш. дык і зусім адмовіліся.

Кантрольныя лічбы не даведзены да колгасаў і вёсак, не популярызаваны задачы разьвіцьця жывёлагадоўлі, як вядучай галіны гаспадаркі раёну, ня створана належнае грамадзкае думкі.

Не вядзецца ніякай працы па організацыі кормовай базы і пашырэньню пасеўплошчы пад яравымі культурамі.

Догляд кармленьне жывёлы пастаўлена кепска. Ні адзін колгас не выпрацаваў і ня ўжывае кормавых норм. Корм скарыстоўваецца нерацыянальна. У шэрагу колгасаў ўжо не хапае грубых і люцэрнавых кармоў. У колгасе „Нова Жыцьцё“ „Бальшавік“, „Чырвоная Горка“ корму хопіць толькі на 10-12 дзён.

Ня лепш справа і з разьвіцьцём сьвінагадоўлі. Да вясны 1931 году трэба абудаваць 1.. сьвінарнікаў на 13 347 сьвінаматак і 9002 подсьвінкі. Пачатыя будаўніцтва яшчэ восеньню 1930 году сьвінарнікаў ня скончаны. Па колгасах „Бальшавік“ „Чырвоная Беларусь“ будаўніцтва сьвінарнікаў спынена. Колгасы „Май“ „Перамога“, Сталіна да будаўніцтва сьвінарнікаў не прыступаюць. Шэраг колгасаў ня вывозіць лесаматэрыялу.

Плян укомплектаваньня ня выканана. Па колгасах раёну маецца ўсяго толькі 508 галоў, тады як плянам прадугледжана да канца 1931 году давесьці гурт сьвінаматак да 13347 штук, а падсьвінкаў—да 9008 штук.

Плян разьвіцьця сьвінагадоўлі не даведзен да колгасаў вёсак. Няма масавай работы. Не мобілізавана ўвага колгасьнікаў і аднаасобнікаў на пасьпяховае вырашэньне проблемы жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі.

Што ж робяць райколгас райжывёлаводсаюзы?—Нічога. Опортуністычнае кіраўніцтва гэтых кіруючых устаноў, скараціўшы кантрольныя лічбы разьвіцьця жывёлагадоўлі, на гэтым і супакоілася.

КСМ організацыя Старых Дарог ня ўключылася ў барацьбу за 100 проц. выкананьне пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі таму, што жывёлагадоўля не прадугледжана іх плянам.



Плянавая „ўвязка“.

„Не прадугледжана плянам“

Нельга абыйсьці моўчкі і комсамольскай організацыі. Райком і ячэйкі ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў барацьбе за выкананьне пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі. Паасобныя сэкратары комсамольскіх ячэек і кіраўнікі з райкому комсамолу сваю бязьдзейнасьць тлумачаць тым, што гэта пытаньне ня ўключана ў плян іх працы і г. д.

Сьвінаводчая эстафэта, якую праводзў комсамол Беларусі, прайшла ў раёне незаўважна. Комсамольскія ячэйкі ня скарысталі яе, каб зьдзейсьніць паварот ячэек тварам да жывёлагадоўлі.

Пададзены матарыял з усёй яскравасьцю сьведчыць аб тым, што дырэктывы партыі і ўраду аб разьвіцьці жывёлагадоўлі і спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў Стара-Дароскім раёне злачынна ня выконваюцца. Мы патрабуем ад адпаведных партыйных, комсамольскіх, савецкіх і іншых організацый прыняць рашучыя меры да опортуністычнай практыкі паасобных кіруючых раённых організацый і прыцягнуць вінаватых у зрыве дырэктыў партыі да адказнасьці.

А. ЗАСЛАЎСКІ.

Правальваюць будаўніцтва жывёлагадоўчых фэрм

Па Сьмілаўскім раёне павінна быць організавана 11 малочных фэрм з 1012 галовамі буйнай рагатай жывёлы і 7 сьвінаводчых фэрм. Аднак, організацыя малочных фэрм праходзіць марудна. Фэрмы („Савецкая Беларусь“ і інш) не забясьпечаны кормам, а ў некаторых фэрмах корму хопіць толькі на некальві тыдняў. Падрыхтоўка да засеву корму яшчэ не распачата адчуваецца вялікі недахоп у насеньні.

Комсамольская організацыя не займаецца пытаньнем вырашэньня кармовай проблемы.

Г. Фрыд.

Супроць ураду ўціску, голаду і убоства

Сусьветны экономічны крызыс з асаблівай сілай накінуўся на прыціснутую цяжарам вэрсальскага міру і пляну Юнга, Нямеччыну.

З кожным месяцам падае продукцыя нямецкіх фабрык і заводаў. У некаторых галінах прамысловасьці колькасьць выпускаемай продукцыі зьменшылася за апошнія гады ў два разы. Многія прадпрыемствы працавалі ня поўны рабочы тыдзень і выкарысталі ўсяго 59 проц. свайго абсталяваньня. Усе сваі страты капіталісты стараюцца спагнаць за кошт рабочае клясы. Рэзка зьніжана зарплата. У сярэднім за год зьніжана на 12 проц., а на некаторых прадпрыемствах яшчэ больш. Беспрацоўе ахапіла звыш 5 мільёнаў рабочых. Калі ўключыць сюды і членаў сям'яў беспрацоўных, дык выйдзе, што каля 15 мільёнаў чалавек жывуць выпадковым заработкам, або жабрацкімі падачкамі, якія зрэдку кідае ім фашыцкі ўрад Брунінга.

Умовы працы і жыцьця нямецкага пролетарыяту пагаршае таксама ўзмоцненая пагоня капіталістых за рынкамі збыту. Каб захапіць сабе збыт, нямецкая буржуазія зьніжае цэны на тавары за кошт рабочых. Эксплёатацыя становіцца яшчэ больш лютай і жорсткай. Буйнейшы хэмічны канцэрн (аб'яднаньне хэмічных прадпрыемстваў) толькі за 3 месяцаў звольніў 2 тысяч рабочых, павялічыўшы адначасова продукцыю на 10 проц. Другое буйнейшае прадпрыемства, ня зьніжаючы колькасьць і продукцыі, увяло пяцідзённы рабочы тыдзень і зьнізіла зарплату на 60 проц.

Конвэерная сыстэма, уведзеная на буйных прадпрыемствах, дала прадпрыемцам магчымасьць выкідаць на вуліцу дарослых, найбольш высока плачаных, кваліфікаваных рабочых і ставіць да конвэера маладых рабочых і жанчын.

На абутковай фабрыцы „Кайзэра“, калі ўвёдзілі конвэер, усіх рабочых замянілі маладымі работніцамі, пры гэтым выпрацоўка павялічана з 400 да 900 пар, а зарплата зьніжана з 40 да 18 марак у тыдзень. Заводы Бэкера былі закрыты на 14 дзён, пасьля чаго на работу прынялі выключна моладзь.

Заработная плата рабочай моладзі і ў асаблівасьці маладых работніц у тры разы меней зарплаты дарослых рабочых. У Мансфэльдзкім вугальным раёне вучань—забойшчык, да 20 гадоў узросту, улетку 1930 году атрымоўваў 5 марак 15 пфэнігаў (2 р. 55к.) у тыдзень, а цяпер—4 з палов й маркі.

Яшчэ цяжэйшыя ўмовы працы маладых батракоў і батрачак. За 11 гадзіннаю, а ў час летніх палявых работ за 13-14 гадзінны працоўны дзень, яны атрымліваюць ня больш 50 пфэнігаў (25 кап.), г. зн. 4 у разы меней дарослага батрака. Пры гэтым зарплата выдаецца натурай „сярэдняй якасьці“. Напрыклад—дрэнным зярном, сырымі дровамі. Ня гледзячы на масавае ўцягненьне моладзі ў вытворчасьць, звыш 20 проц. беспрацоўных складаюць маладыя рабочыя.

Нячуваная эксплёатацыя і цяжкія ўмовы жыцьця штурхаюць на барацьбу супроць капіталістых і абараняючага іх інтарэсы ўраду Брунінга.

У клясавых бойках у Мансфэльдзе, Паўночна-Заходняй прамысловай вобласьці, у забастоўцы мэталістых Бэрліна, Золінгена, і Ганновэра, гарбароў Штутгарта, усюды моладзь, наперакор стараньням буржуазіі распаліць варожасьць паміж двума пакаленьнямі, змагалася плячом к плячу з дарослымі рабочымі. У час апошняй здрадніцкі задушанай забастоўкі рурскіх вуглякопаў, моладзь першая выкінула з глыбіні шахты баявы кліч: „Даеш Чырвоны профсаюз гарнякоў у Нямеччыне“.

Моладзь вядзе і самастойную барацьбу. На працягу апошняга году ёю былі праведзены 10 забастовак.

Але рабочая моладзь яшчэ недастаткова організавана, недастаткова спаяна. Фашысцкая буржуазія і рэформістыя (меншавікі) усімі сродкамі імкнуцца ўцягнуць яе ў свае організацыі, блытаць фашысцкай і рэформісцкай ідэолёгіяй, прытупіць яе клясавую сьвядомасьць. На прадпрыемствах утвараюцца спартыўныя клюбы, гурткі харавых сьпеваў, военныя ячэйкі і іншыя фашысцкія організацыі. Чырвоныя маладзёжныя клюбы зачыняюцца. Орган рэволюцыйнай моладзі „Юнге Гардэ“ пэрыодычна конфіскуецца і забараняецца на цэлыя месяцы.

Але з кожным днём комсамол заваёўвае ўсё больш шырокія масы рабочай моладзі і пасьпяхова адкалвае маладых рабочых, уцягнутых у социял-фашысцкія і фашысцкія організацыі. З усіх канцоў Нямеччыны паступаюць паведамленьні аб выхадзе маладых социял-дэмократычных і фашысцкіх рабочых з сваіх фашысцкіх організацый і аб пераходзе іх у комсамол. У Лейпцыгу 15 маладых рабочых вышлі з социялістычнага „саюзу“ рабочай моладзі, заявіўшы, што саюз не социялістычны і не рабочы. У Гельдэнаў распушчана цэлая організацыя маладых социялістых, якая складалася з 1.0 чалавек, за „ліквідатарскія настроі“. У Дрэзьдзене група маладых работніц вышла з гітлераўскай (фашысцкай) організацыі і перайшла ў комсамол.

Пры гэтай абстаноўцы нямецкі комсамол стаіць перад асабліва вялікімі задачамі. Разгортваючы бязьлітасную барацьбу супроць фашызацыі моладзі, яе політычнага бяспраўя і яе шалёнай эксплёатацыі прадпрыемцамі — комсамол, пад кіраўніцтвам нямецкай партыі, мобілізуе ўсю працоўную моладзь на ўтварэньне адзінага баявога фронту рабочых і моладзі супроць наступленьня фашысцкай дыктатуры, супроць ураду Брунінга, ураду пляну Юнга, убоства і голаду.

М. ПЕРНІК.

РАУНЯЙСЯ па Дрысе!

Шляхам арганізацыі ўдарных вячорак дапаможам колгасам апрацаваць і здаць лён

Прыклад бальшавіцкага змаганьня за лён

Дрыса, 12. (Хуткай поштай ад нашага юнкора). Плян ільназагатовак у Дрысенскім раёне быў вызначаны Наркамгандлем у 480 тон. Абгаварыўшы гэтыя заданьні, раён даў сустрэчны плян—на 560 тон.

Каб выканаць гэта баявое заданьне былі мобілізаваны масы колгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадпякоў. Гэта пытаньне было заслухана на кустовых партсходах, раённым зьлёце колгасьнікаў, райконфэрэнцыі асьветнікаў, райзьлёце колгасьніц, райконфэрэнцыі груп бедноты і г. д.

Дзякуючы гэтаму пляны ільназагатовак былі поўнасьцю даведзены да кулацка-заможных двароў, вёсак і колгасаў.

На 5 лютага плян выкананы на 71 проц. Колгасы здалі 71 проц., кантрактоўшчыкі—81 проц. і індывідуальны сэктар—68 проц. Кулацка-заможныя гаспадаркі цьвёрдыя заданьні выканалі на 93 проц.

Значную дапамогу ў рабоце парторганізацыі па ільназагатоўках аказалі жанчыны-дэлегаткі і комсамольскія арганізацыі.

Дэлегаткі арганізавалі спэцыяльныя брыгады па дапамозе колгасам у апрацоўцы лёну (ст. Дрыса і інш.).

Па лініі комсамолу ў вёскі былі накіраваны брыгады раённага комсамольскага актыву. Некаторыя комсамольскія ячэйкі наладзілі ўдарныя вечары па апрацоўцы і надрыхтоўцы да здачы лёну.

Новікаўская комсамольская ячэйка арганізавала ўдарны вечар. На вечар была прыцягнута беспартыйная моладзь. Апрацавалі рэшту лёну ў копуне „Верны Шлях“.

Але побач з гэтым трэба адзначыць, што некаторыя ячэйкі, як Цястаўская, ніякага ўдзелу ў ільназагатоўках ня прынялі

Каб узмацніць тэмпы і канчаткова выканаць плян ільназагатовак да 20 лютага, у сельсаветы накіраваны брыгады з раённага партыйна-комсамольскага актыву.

П. ЦЫРА.

Беллёнсаюз зрывае ільназагатоўкі

МАГІЛЕЎ, 12.—(Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).—Па партыйна-профсаюзнай лініі вылучаны для пасылкі ў раёны 37 чалавек правесьці двухдэкаднік штурму прарываў у ільназагатоўках. Сёньня частка вылучаных выехала ў раёны.

Беллёнсаюз затрымлівае высылку грошай, чым зрывае работу брыгад апорнага пункту. Тэлеграфавалі, але адказу і выклікаў па сёньня няма.

Неабходна прыняць рашучыя захады да зрыўшчыкаў ільназагатовак і забясьпечыць безадкладны ад'езд мобілізаваных у раёны.

Віт. Сідарук

КУЛАЦТВА НЕ ЗДАЕ ЛЁН

У ільназагатоўках па Сьмілаўскім раёне ніякога пералому яшчэ няма. Большасьць колгасаў раёну ня прымае ўдзелу ў загатоўках ільна-валакна і ільна-насеньня. Так, напрыклад колгасы „Сталіна“, „Савецкая Беларусь“, „Новы Шлях“, „Рабочы“, „Пацігодка“, „Комінтэрн“, „Бязбожнік“ і „Вясёлае Жыцьцё“ ніводнага кілё лёну дзяржаве не здалі.

Кулацтва сабатуе і ня выконвае цьвёрдых заданьняў, а сельсаветы прымірэнча адносяцца да кулака і яго агентуры (Пярэжыр, Голацак, Рудзенск, Дукора, Вальвачы і інш.).

У Рудзенскім сельсавеце кулакі не здалі дзяржаве лёну. Плян загатовак па сельсавеце пад пагрозай зрыву. Заданьне загатовіць 9400 кілёграм ільна-валакна ня выконваецца. Загатоўлена толькі 80 кілёграм. Ільна-насеньня трэба загатовіць 9620 клг., загатоўлена толькі—330 клг.

Комсамольская арганізацыя раёну прымае зусім слабы ўдзел ў ільназагатоўках. Трэба прыцягнуць да адказнасьці опортуністых—зрыўшчыкаў ільназагатовак

Г. Фрыд

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ШТУРМ

Магілёў, 11-II (па тэлеграфу ад нашага спэцкора).—Плян ільназагатовак па Магілеўскім раёне на 5 лютага выкананы толькі на 24,6 проц. Учора адбыўся суд над 10-ю кулацкімі гаспадаркамі, якія ня выконвалі цьвёрдых заданьняў па ільназагатоўках. Зрыўшчыкі загатовак пазбаўлены волі на розныя тэрміны.

Комсамольская арганізацыя Магілеўшчыны ўключылася ў двухдэкаднік штурму і абвясьціла сябе мобілізаванай. На вёску кінуты актыў для праверкі работы па спаганьню з кулацка-заможных гаспадарак ільна-валакна.

Апорны пункт ЦКК РСІ Беларусі і Наркамгандлю для практычнай дапамогі вясковым комсамольскім ячэйкам, сельсаветам і райвыканкому ў разгортваньні работы сярод бядняцка-серадняцкай часткі па выкананьню пляну ільназагатовак, мобілізаваў і накіраваў у раёны 26 комсамольцаў.

Учора райком КП(б)Б абгаварваў пытаньне аб рабоце апорнага пункту і мобілізацыі партыйнага актыву для дадатковай пасылкі у вёскі.

Лёгкая кавалерыя Магілеўшчыны яшчэ не мобілізавана для сыстэматычнай праверкі работы ільназагатоўчых апаратаў.

Віт. Сідарук

14-га лютага, а 7-ай гадз. увечары, у Доме Комасьветы, пак. № 6 (уваход з вул. К. Маркса) адбудзецца групавая консультацыя для газэтных работнікаў на тэму:—„Нізавы друк у змаганьні за транспорт“. На консультацыю павінны зьявіцца члены рэдкалегій насьценгазэт і шматтыражак і рабкоры.

За 40-тысячны тыраж „Чырвонай Зьмены“

ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“— КОМСАМОЛІІ ЛЁЗНЫ

Выкананьнем і перавыкананьнем кантрольных лічбаў, даных пленумам ЦК ЛКСМБ, прасунем „Чырвоную Зьмену“ ў шырокія масы працоўнай моладзі

ЗМАГАЦЦА ЗА 40.000

На кастрычнікаўскім пленуме ЦК ЛКСМБ прадстаўнікі 105 раённых камітэтаў комсамолу склалі з рэдакцыяй „Чырвонай Зьмены“ соц. умову па даведзеньню тыражу „Ч. З.“ да 40.000 экзм. Гэтая соц. умова была першым крокам у галіне мобілізацыі увагі ўсіх раённых камітэтаў і ячэек комсамолу вакол большага ахопу комсамольцаў, рабочай і сялянскай моладзі газэтай.

Стаўка на 40-тысячны тыраж „Чырвонай Зьмены“ пры 100000 арганізацыі комсамолу была і зьяўляецца самай рэальнай лічбай.

Але гэтага не ўразумеў шэраг комсамольскіх камітэтаў. Яны прынялі соц. умову за кампанію.

У выніку, з-за опортуністычнай недаацэнкі соц. умовы, абавязак па тыражу на люты месяц ня выкананы.

Толькі 19 раёнаў выканалі кантрольныя заданьні па тыражу. Да іх у першую чаргу адносяцца: Лёзьненскі раён—187 проц. заданьня, Сьмілавіцкі—175 проц, Бешанковіцкі—165 проц, Самахвалаўскі—155 проц. і Рагачэўскі—150 проц. кантрольнага заданьня.

Астатнія (за выключэньнем эшчэ 14 раёнаў) ня выканалі заданьняў па падпісцы.

Занесеныя сеньня на чорную дошку 15 раёнаў, якія павінны былі даць 4100 экз., а далі толькі 31 проц, у мінулым месяцы папераджаліся намі, што будуць занесены на чорную дошку.

Але яны ня прынялі пад увагу сыгналу „Чырвонай Зьмены“ і не мобілізавалі масу комсамольцаў вакол узьняцьця тыражу „Чырвонай Зьмены“.

Сёньня таксама прыходзіцца падкрэсьліць, што шэраг раёнаў, паказаўшы у студзені ўзорныя прыклады барацьбы за тыраж, у лютым пачалі здаваць тэмпы. Да такіх адносяцца: Рагачэўскі раён, які з 300 проц. за студзень м-ц сышоў на 150 проц, Слуцкі—з 200 проц. на 122 проц і Койданаўскі—з 160 проц. на 116 проц.

Слуцкі раён, атрымаўшы за добрую работу па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ пераходны сьцяг, ня мог яго ўтрымаць за сабою. Сёньня гэты сьцяг мы перадаем Лёзьненскаму раёну, які выканаў заданьне на 187 проц.

Барацьба за пераходны сьцяг працягваецца.

Комсамольскія камітэты і ячэйкі, і ў першую чаргу тых раёнаў, якія мы сёньня заносім на чорную дошку, павінны прыняць самыя рашучыя захады, каб змыць з сябе брудную пляму.

Заданьне па 40-тысячнаму тыражу „Чырвонай Зьмены“ павінна быць выканана.

Заносім на чорную дошку далакопаў тыражу „Чырвонай Зьмены“

РАЁН	Заданьні	Выканаў
1. Мазырскі	1000 экз	283 экз.
2. Азарыцкі	250 „	97 „
3. Асьвейскі	200 „	94 „
4. Шклоўскі	400 „	107 „
5. Расонскі	200 „	47 „
6. Лепельскі	300 „	178 „
7. Чачавіцкі	200 „	69 „
8. Чашніцкі	250 „	78 „
9. Межынскі	100 „	34 „
10. Сураскі	200 „	91 „
11. Вычачанскі	200 „	99 „
12. Лоеўскі	200 „	53 „
13. Камарынскі	200 „	80 „
14. Быхаўскі	300 „	95 „
15. Багушэўскі	200 „	98 „

Рэкорднае зьніжэньне

У Менскім Белпэдтэхнікуме 600 студэнтаў. Сярод іх—200 комсамольцаў.

Здавалася-б, што тут удзячная глеба для прасоўваньня газэты „Чырвоная Зьмена“ сярод моладзі.

Але, на вялікі жаль, гэта глеба не скарыстоўваецца. Калі ў студзені месяцы выпісвалася 110 экз., дык у лютым—усяго 15.

Гэта ганебная зьява тлумачыцца тым, што ўпаўнаважаныя па друку ня хочуць займацца такой „дробязнай“ работай.

Не пашкодзіла-б, каб бюро колектыву ЛКСМБ Менскага Белпэдтэхнікуму заўялося праверкаю, як наладжана выпіска комсамольскага друку сярод студэнтаў і дало зразумець упаўнаважаным, што распаўсюджваньне друку ня „дробязная“ справа.

Комсамолец

Замест 200—выпісалі 277

Расьненскі РК КСМ сваё заданьне па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ перавыканаў.

Замест 200 экземпляраў па раёне распаўсюджана 277.

У далейшым ня трэба зьніжаць тэмпы

Д.

Кандыдаты на чорную дошку

Комсамольскія ячэйкі Заслаўскага раёну вельмі слаба змагаюцца за выкананьне кантрольнага заданьня па падпісцы на „Чырвоную Зьмену“. Асабліва дрэнна выпісваецца „Чырвоная Зьмена“ ў Заслаўскай, Траскоўскай і Старасельскай ячэйках.

Бабок.

Пухавіцкая сямігодка плянецца ў хвасьце

У Пухавіцкай сямігодцы не разгорнута праца па распаўсюджваньню газэты „Чырвоная Зьмена“ З 270 вучняў „Чырвоную Зьмену“ выпісвае толькі чалавек 60.

Неабходна зараз-жа наладзіць гэтую працу.

Вінцесь.

„Чырвоная Зьмена“ яшчэ не ў пашане ў Вузьдзенскім РК ЛКСМБ

Ужо ня раз пісалася аб тым, што Вузьдзенская комсамльская арганізацыя ганебна адстае ў падпісцы на „Чырвоную Зьмену“.

РК ЛКСМБ „у парадку рэагаваньня на допісы“ вылучыў райўпаўнаважаным такога чалавека, які вельмі заняты іншай работай, і падпіскай на „Чырвоную Зьмену“ не займаецца.

Як была дрэнай падпіска ў раёне, так і засталася. А РК задаволены сваёй „разумнай“ пастановай.

К.—нік

Для іх газэта—ноль увагі

Комсамольская ячэйка вёскі Гразіўца (Клімавіцкі раён) ніякай працы па распаўсюджваньню комсамольскага друку не вядзе.

Аб выпісцы „Чырвонай Зьмены“ зусім забыліся. Нават сам сэкратар комсамольскай ячэйкі, тав. Кавалёў яе ня выпісвае.

Трэба адзначыць, што комсамольцы наогул ніякіх газэт ня выпісваюць.

РК КСМ павінен зацікавіцца, якая чытаемасьць у комсамольцаў раёну.

Лясны.

Заданьне перавыканалі

Комсамольцы гомельскай фабрыкі „Праца“ каб прасунуць маладзёжны друк у гушчу моладзі, рашылі на сваіх сходах узяць за кантрольную лічбу выпіскі 150 экз. „Чырвонай Зьмены“.

Дзякуючы добра праведзенай працы сярод моладзі, комсамолія ф-кі „Праца“ выканала сваю пастанову на 125 проц.

Круглянскі.

Атрымалі чырвоны сьцяг

Бачэйкаўская савгаская ячэйка, Бешанковіцкага раёну за лепшае распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“ атрымала ад РК ЛКСМБ пераходны чырвоны сьцяг. Заданьне ў 35 экзэмпляраў ячэйка перавыканала, сабраўшы 130 падпісчыкаў на тэрмін ад 3 месяцаў да 1 году. „Чырвонай Зьменай“ забясьпечаны ўсе комсамольцы, вучні і рабочыя савгасу.

Пост „Чырвонай Зьмены“,—Глікман.

Калісьці меркавалі..

Яшчэ спачатку гэтага году меркавалася ўвесьці політэхнізацыю ў Слуцкіх школах, але да гэтага часу амаль нічога ня зроблена.

Хаця у некаторых школах гэта кампанія і пачынае ўжо праводзіцца, але праца разгорнута не дастаткова.

Я. Жылка

Конфэрэнцыя рабочай моладзі гор. Менску

пераносіцца

на 26 ЛЮТАГА 1931 году.

Менгарком ЛКСМБ.

Час. вык. абав. адк. рэдактара—С. АНІСАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599